Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛІСТАПАДА 2015 г. ПЯТНІЦА № 225 (28083) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Медыкі пракансультуюць анлайн**

СТАР. 4



**Пра натхненне і літаратуру**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# НА ЗРАЗУМЕЛАЙ МОВЕ

## Партнёрства Беларусі і Сербіі набывае новыя грані, становіцца ўсё больш важкім і выніковым

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са сваім сербскім калегам Таміславам Нікалічам, які знаходзіцца ў Мінску з афіцыйным візітам.**

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Таміславу Нікалічу за падтрымку як на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах, так і на гэтых, і сербскаму народу за тое, што ў апошні час удалося прасунуцца ў адносінах.

Гаворачы аб гандлёва-эканамічных стасунках, Прэзідэнт Беларусі нагадаў аб пастаўленай перад урадамі дзвюх краін задачы па дасягненні аб'ёмаў узаемнага гандлю ў $0,5 млрд. У 2014 годзе краіны дасягнулі ўжо $250 млн таваразвароту. «Сёлета мы таксама прырастаем у нашым таваразвароце, так што, думаю, у найбліжэйшы час, прынамсі ў гэтай пяцігодцы, мы дасягнем таго ўзроўню, які з вамі намецілі. Я буду вельмі рады, і, думаю, вы таксама, калі нам прыйдзецца адкарэктаваць гэтую лічбу ў бок павелічэння», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Што тычыцца палітычных адносін, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што праблем таксама няма. «Мы заўсёды вас падтрымлівалі і будзем падтрымліваць, гэтак жа, як і вы, у міжнародных арганізацыях. Мы паабяцалі, што падчас вашага старшынства ў АБСЕ зробім максімум для таго, каб вы ніколі не сказалі, што мы былі пасіўныя ў гэты перыяд», — дадаў беларускі лідар.

Ён нагадаў, што Беларусь нядаўна наведваў міністр замежных спраў Сербіі. Адбылася канструктыўная гутарка, абмеркаваны многія пытанні, больш за ўсё закранালі тэму Украіны.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# МАЛАДЫЯ ПАРАСТКІ



Фота БЕЛТА.

**На базе Пачэпаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад — сярэдняя школа» Краснапольскага раёна школьнікі заклалі гадавальнік з пяці тысяч саджанцаў ігрушы, яблыні, вішні, чарэшні, маліны, парэчкі, буякоў. Гэта зроблена ў рамках праекта «Зялёная эканоміка для адраджэння вёскі», асноўная мэта якога — падтрымаць вітамінная прадукцыяй малазабяспечаныя сем'і ў раёнах краіны, пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі. Вучні самі даглядаюць новы сад: увосень, напрыклад, пад кіраўніцтвам загадчыка школьнай гаспадаркі Уладзіміра АНДРЫЯНАВА абразаюць саджанцы.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянцін ЧЭКАНАЎ, міністр гандлю:**

*«Для гандлю ў сувязі з дэнамінацыяй ніякіх акругленняў і спекуляцый з павышэннем узроўню цэн быць не павінна. Роўна як і для пастаўшчыкоў. Трэба сёння стаць на абарону насельніцтва. Калі мы бачым, што тавар у гандаль паступае па цане на 5-15% вышэйшай, нельга маўчаць і прымаць гэты тавар. І ні ў якім разе не дапускаць павышэння цэн самімі аб'ектамі гандлю. Тут у нас наперадзе вялікі кавалак працы. Гэта два цэннікі, прывядзенне ў адпаведнасць, закупка касавых апаратаў, навучанне кадраў і гэтак далей. Падрыхтоўчая работа да дэнамінацыі будзе адной з цэнтральных задач на працягу першага паўгоддзя 2016-га».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17924,00 | ▲ |
| Еўра | 19131,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,22 | ▲ |
| Укр. грыўня | 751,53 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Падпісацца на газету на I квартал 2016 года можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.